МАЎКЛІВАЯ ПАМЯЦЬ ШУМНЫХ ВУЛІЦ

3

ЧАС ЧЫТАЦЬ КЛАСІКУ

8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

17 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. СУБОТА

№ 115 (29995)

ЗВЯЗДА

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ГАЛОЎНАЕ Ў АЦЭНЦЫ КАДРАЎ — ВЫНІК»

Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях удасканалення работы з кадрамі

Фота Ваеў А.

Прэзідэнт адразу абазначыў, чым выклікана размова на зададзеную тэму. Па яго словах, кадравае пытанне патрабуе ўсебаковага вывучэння. Акрамя таго, неабходна ліквідаваць недахопы, выназначыцца, у якім напрамку рухацца далей. І тое, што ў абмеркаванні найважнейшага пытання, як падкрэсліў беларускі лідар, узяў удзел прадстаўнічы склад (кіраўніцтва Адміністрацыі Прэзідэнта, урада і парламента, губернатары, міністры, памочнікі кіраўніка дзяржавы па абласцях), цалкам абгрунтавана. У гэтай сувязі Аляксандр Лукашэнка згадаў класіка, які сказаў, што кадры вырашаюць усё. «І гэта сапраўды так. Як бы ні спрабавалі за апошні час замусоліць гэтыя словы, гэта ісціна», — задаў тон размовы Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што ў краіне выбудавана стройная сістэма кіравання дзяржавай. Эканомікай займаецца ўрад. Кадравая палітыка, ідэалогія, прававы кантроль і падрыхтоўка нарматыўна-прававых актаў кіраўніка дзяржавы — зона адказнасці Адміністрацыі Прэзідэнта. На губернатарах — такія ж функцыі, але, зразумела, на ўзроўні вобласці. Па адпаведнай сістэме працуюць у гарадах і раёнах.

«НЕ ХАПАЕ РАЗВАРОТЛІВАСЦІ»

«Усё выбудавана, адказныя вызначаны, але калі вы спытаеце, ці задаволены я работай, выбудаванай сістэмай функцыянавання кадраў, адразу скажу: не, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Мы маем прававую базу, добры практычны досвед, але час не стаіць на месцы, таму трэба работу ўдасканальваць. Магчыма, і сістэму».

Прэзідэнт адзначыў, што ўдасканаленне кадравай работы з'яўляецца складаным, шматузроўневай задачай. Прычым яна датычыцца не толькі вытворчай, але і сацыяльнай сферы. «Не адкрыю Амерыку, калі падкрэслю, што сітуацыя застаецца найбольш стабільнай у калектывах, дзе прымаюцца ўсе магчымыя меры для замацавання кадраў, у тым ліку маладых спецыялістаў, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Як замацоўваць кадры, я нават не хачу расказваць. У нас ёсць каласальны вопыт работы ў савецкі перыяд. Ды і ў наш перыяд нядзённыя падыходы, прыклады. Мы пра іх ведаем».

Аднак, як дадаў Прэзідэнт, у краіне ёсць яшчэ і тыя, хто працуе па прынцыпе «латання дзірак». «Стварэннем прывабных сацыяльна-бытавых умоў ім займацца няма калі, мець зносіны з калектывам яны не ўмеюць, а часам проста і не хочуць, — канкрэтызаваў беларускі лідар. — У той жа час асобныя кіраўнікі мясцовай улады не разумеюць усёй глыбіні пытання і бяздзейнічаюць».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што пры нядобрасумленным стаўленні нават самыя амбіцыйныя эканамічныя планы застануцца на паперы. Гэтага, вядома, Прэзідэнт дапусціць не можа.

Аналізуючы сітуацыю, кіраўнік дзяржавы яшчэ ў кастрычніку мінулага года засродзіў увагу на гэтай праблеме. Адміністрацыі Прэзідэнта і ўраду было даручана ўкараніць сістэму ўзгаднення кадравых перамяшчэнняў: ад аблвыканкама да самага нізавога ўзроўню. У гэтай сувязі кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, як гэтая сістэма рэалізоўваецца на месцах, ці дастаткова прынятых мер, магчыма, патрэбны дадатковыя рашэнні Прэзідэнта.

СТАР. 2

Высакародная і смелая прафесія

Работнікам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь

Дарагія сябры!

Віншую вас з Днём медыцынскіх работнікаў.

Даючы клятву вернасці прафесіі, вы бераце на сябе адказнасць за лёсы людзей, за жыццё і здароўе кожнага пацыента. Гэта высакародны і смелы выбар.

Добрасумленна і бескарыслівa выконваючы свой прафесійны абавязак, праяўляючы шчыры клопат і міласэрнасць да тых, хто мае патрэбу ў вашай дапамозе, асабліва ў самых аддаленых кутках Беларусі, пастаянна развіваючы кампетэнцыі і тэхналогіі, вы ўмацоўваеце імідж айчыннай аховы здароўя, якая па многіх пазіцыях прызнаецца адной з найлепшых у свеце.

У гэты святочны дзень дзякую ўсім медыцынскім работнікам, хто з гонарам праходзіць выпрабаванні новымі выклікамі і пагрозамі жыццю і здароўю беларусаў, забяспечваючы грамадскую згоду і нацыянальную бяспеку краіны.

Ад усёй душы жадаю вам і вашым сем'ям шчасця, дабра і дастатку.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

На фота: урач рэанімацыйнай брыгады Дзмітрый ДУБАКІН.

З нагоды

ЗМАГАЦЦА ДА АПОШНЯГА

Запуск сэрца праз паўтары гадзіны пасля спынення, тысячы выратаваных лёсаў і бездакорная адданасць сваёй прафесіі — урач рэанімацыйнай брыгады Віцебскага абласнога цэнтра хуткай медыцынскай дапамогі Дзмітрый ДУБАКІН — асоба ў медыцынскім асяроддзі легендарная. Калегі шчыра называюць яго самым лепшым доктарам, а ён сціпла, на працягу 30 гадоў, дзень за днём заступае на варту грамадскага здароўя.

НА СВАЕ ВОЧЫ

На прафесійны выбар тады яшчэ юнака Дзімы паўплываў жывы прыклад яго маці, якая ўсё жыццё працавала ўрачом на віцебскай станцыі. Хлапчуком часта даводзілася бываць з мамай на зменах, тады Дзмітрый і заўважыў, што чалавек можа быць мацнейшы за смерць, а жаданне дапамагаць людзям перасіліла перасцярогі аб складанасці прафесіі.

«Я падумаў і абраў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт, хоць першым часам было вельмі складана: вялікі аб'ём інфармацыі, спецыялізаваныя дысцыпліны. Некаторыя з маіх аднагрупнікаў пакінулі сцены ўніверсітэта, таму што баяліся крыві. А я, на дзіва, чамусьці не баяўся нічога, хапаў веды і імкнуўся хутчэй выйсці на практыку», — успамінае ўрач.

Паглядзеў Дзмітрый Уладзіміравіч і на сферу ваеннай медыцыны, аднак падвёў зрок. На «хуткай» пачынаў санітарам, уважліва глядзеў за маніпуляцыямі калег і набіраўся вопыту, праз год стаў працаваць медбратам. Мінуў яшчэ год — і Дубакін стаў фельчарам, а з 1993-га і да сённяшніх дзён займае пасаду ўрача. Спачатку атрымаў вопыт у лінейнай брыгадзе, пасля — у інтэнсіўнай тэрапіі, а калі ва ўстанове сфарміравалі рэанімацыйную брыгаду, Дзмітрый стаў першым, каго абралі кіраўніком залатога рэзерву станцыі.

БАРАЦЬБА НА МЯЖЫ

Больш чым за 30 гадоў у прафесіі ўрач наглядзеўся многага. Сустракалі брыгаду на выкліках і з газавым пісталетам, і з занесеным над галавой нажом... Тады прыходзілася выключаць асабістыя эмоцыі і ўключаць псіхолага, прычым апошнім урач карыстаецца не толькі ў вострых сітуацыях, але і ва ўсіх, дзе фігуруе боль страты. Аднак гэтыя гісторыі Дзмітрый Уладзіміравіч успамінаць не любіць, адзначае, што культура падзякі пацыентаў работнікам хуткай дапамогі працуе і дагэтуль, што не можа не радавать усіх членаў брыгады.

СТАР. 2

Напярэдадні

АЛІМПІЙСКІ ПАДАРУНАК, ЯКІ БЕЛАРУСЫ ЗРАБІЛІ САБЕ САМІ

II ИГРЫ СТРАН СНГ БЕЛАРУСЬ 2023

Як ствараўся і чым жыве цяпер САК «Алімпійскі»

У маі 1997 года ў гісторыі беларускага спорту пачалася новая старонка — Прэзідэнтам Нацыянальнага алімпійскага камітэта быў абраны Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы адразу абазначыў асноўныя задачы, якія трэба было вырашыць для эфектыўнай рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў спорце. Першая — захаванне створанай папярэднімі пакаленнямі трэнераў і арганізатараў беларускай школы ў розных відах спорту. Другая — уцягванне дзяцей і моладзі ў спартыўны рух, фарміраванне сістэмы іх аздараўлення і алімпійскай адукацыі. Гэта задача вельмі ўдала ўвасобілася ў глабальным праекце Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

17 сакавіка 1998 года выдадзена распараджэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб некаторых пытаннях» па стварэнні САК «Алімпійскі». У самым сэрцы беларускай сталіцы на плошчы 16 гектараў закіпела работа па стварэнні ўнікальнага спартыўнага комплексу. Яго галоўным прызначэннем на старце было вызначана прыцягненне насельніцтва да паўнацэннага, актыўнага адпачынку, заняткаў фізічнай культурай, аздараўленне дзяцей і дарослых.

СТАР. 6

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Больш чым 100 чалавек забіты ў Судане падчас сутыкненняў у лагерах для перамешчаных асоб



Звыш сотні чалавек забіты ў штаце Паўночны Дарфур у Судане ў выніку сутыкненняў унутры і вакол лагераў для перамешчаных асоб. Пра гэта паведамілі ў «Твітэры» вярхоўны камісар ААН па справах бежанцаў Філіпа Грандзі, звярнуўшы ўвагу таксама на «шакавальныя паведамленні аб жахлівым сексуальным гвалце ў адносінах да жанчын і дзяўчынак». «Сітуацыя пагоршыцца, калі бакі канфлікту не пагодзяцца спыніць вайну, якая разбурае Судан», — рэзюмаваў Грандзі. Сітуацыя ў Судане абвастрылася з-за рознагалоссяў паміж камандуючым арміяй Абдэль Фатахам аль-Бурханам, які таксама кіруе Суверэнным саветам, а таксама кіраўніком сіл хуткага рэагавання Мухамедам Хамданам Дагала. У сярэдзіне красавіка пачаліся сутыкненні паміж дзвюма структурамі каля ваеннай базы ў горадзе Мераве, а таксама ў Хартуме. Паводле апошніх даных прафсаюза ўрачоў Судана, з пачатку баёў загінулі больш чым 950 мірных жыхароў.

Краіны Паўднёва-Усходняй Азіі распрацоўваюць прынцыпы кіравання і этыкі штучнага інтэлекту

Адпаведныя прынцыпы ўсталююць межы тэхналогіі штучнага інтэлекту (AI), якая імклівa развіваецца. Аб гэтым паведаміла агенцтва Reuters са спасылкай на чыноўнікаў, знаёмых з пытаннем. Паводле яго даных, міністры з 10 краін-членаў Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН) у лютым дамовіліся аб неабходнасці распрацоўкі «кіраўніцтва па AI» для рэгіёна, але падрабязнасці абмеркаванняў не паведамлялося. Цяпер жа высокапастаўленыя чыноўнікі паведамілі Reuters, што такое кіраўніцтва фарміруецца, у ім будзе зроблена спроба збалансаваць эканамічныя перавагі тэхналогіі з яе шматлікімі рызыкамі. «Падрыхтоўка праекта працягваецца, і яна можа быць завершана да канца года, перш чым будзе адобрана членамі АСЕАН», — прывядзіць агенцтва словы аднаго з чыноўнікаў. Іншая крыніца заявіла Reuters, што аб прагрэсе могуць паведаміць на сустрэчы міністраў лічбавых тэхналогій АСЕАН у пачатку наступнага года.

Каліфарніец сабраў кубік Рубіка за 3,13 секунды



21-гадовы амерыканскі чэмпіён па спідкубінгу пабіў сусветны рэкорд у гэтым даволі высокаканкурэнтным відзе спорту, сабраўшы кубік Рубіка за 3,13 секунды. Пра гэта паведамляецца на сайце Кнігі рэкордаў Гінеса. Кніга рэкордаў аб'явіла, што каліфарніец Макс Парк устанавіў рэкорд па зборцы механічнай галаваломкі, скараціўшы час на 0,34 секунды. Такім чынам ён палепшыў вынік, устаноўлены кітайскім спідкуберам Юшэнгам Ду ў 2018 годзе. Парк раней займаў другое месца ў гэтым відзе спорту з часам зборкі ў 3,63 секунды. У дзяцінстве ў яго быў дыягнаставаны аўтызм, і ён палічыў спідкубінг «добрай тэрапіяй», пасля чаго стаў займацца дадзеным спортам, паведамілі яго бацькі ў заяве для Кнігі рэкордаў Гінеса. «Быў час, калі Макс не мог нават адкрываць бутэлькі з вадой, але ўсё роўна праяўляў цікавасць да збірання кубікаў Рубіка», — распавялі яны.

КОРАТКА

- Аранжавы ўзровень небяспекі з-за спякоты і ліўняў аб'яўлены сёння ў краіне.
- **ВУП Беларусі ў студзені — маі вырас на 0,9 працэнта.**
- На ЦТ па рускай мове не з'явіліся 960 абітурыентаў, выдалены з выпрабавання два чалавекі.
- **МНС падрыхтавала рэспубліканскую карту дазволеных для купання пляжаў.**
- Парк высокіх тэхналогій падрыхтаваў электронны даведнік «ІТ-абітурыент 2023».
- **Міс і містара студэнцтва Беларусі абяруць 20 чэрвеня.**
- Аб'яўлены намінанты на прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва 2023—2024 гадоў.

Я — малады

Сто і адзін спосаб трымаць удар

Баксёры сталі гасцямі сустрэчы з падлеткамі

У аздараўленчых лагерах Беларусі набірае абароты новы сезон рэспубліканскай інфармацыйна-асветніцкай акцыі «Крок да поспеху». Гэтым летам яна пройдзе ў больш чым 140 установах. На матывацыйных сустрэчах выступяць звыш ста спікераў: вядомыя журналісты, блогеры, спартсмены, вучоныя, ваенныя, артысты і іншыя беларусы з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Карэспандэнт «Звязды» прыняла ўдзел у акцыі ў адной са здраўніц Гомельшчыны: паслухала, як падлеткі літаральна засыпаюць пытаннямі выступоўцаў і не жадаюць адпускаць цікавых гасцей.

СТАР. 6

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА «Да чытача з любоўю!»

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

«Галоўнае ў ацэнцы кадраў — вынік»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як дакладваюць Аляксандру Лукашэнку, такая сістэма створана, аблыканкамамі адпаведныя рашэнні прыняты. Паступова да кіраўнікоў мясцовых органаў і арганізацый прыходзіць разуменне, што за вынікі работы з кадрамі з іх спытаюць. «Але пакуль разварот'івасці відавочна не хапае, — заўважыў беларускі лідар. — Аблвыканкамы не працуюць, як трэба, не кантралююць на належным узроўні дзейнасць раённых і гарадскіх выканкамаў. На месцах часта мы бачым шмат фармалізму, элементарную адсутнасць выканальніцкай дысцыпліны, аб чым ужо казалася нямала».

«ДАРУЧАНА — РЭАЛІЗОЎВАЙЦЕ»

Звярнуў кіраўнік дзяржавы ўвагу і на яшчэ адно пытанне, якое патрабуе абмеркавання. Яно звязана з перамяшчэннем нядбайных начальнікаў з аднаго кіруючага крэсла ў іншае. У беларускага лідара — цэлы спіс падобных фактаў. Традыцыйна Адміністрацыя Прэзідэнта праінфармавала кіраўніка дзяржавы. Аднак, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, кавалерыя мала — трэба яшчэ ўносіць прапановы, прымаць канкрэтныя рашэнні.

Тых людзей, якія перасаджваюць бесталковых кіраўнікоў з аднаго крэсла ў іншае, Прэзідэнт параўнаў з карупцыянерамі. Ён нагадаў, што ў 2014 годзе Дэкрэтам № 5 уведзена забарона працаўладкавання на кіруючыя пасады асоб, звольненых раней па дыскрэдытуючых абставінах. Як дакладваюць кіраўнікі дзяржавы, кантроль за гэтай работай наладжаны, аднак ёсць яшчэ над чым працаваць.

«Асобныя кіраўнікі пачынаюць ліберальнічаць пры расставанні з нядалекімі кіраўнікамі, — прывёў канкрэтныя прыклады Аляксандр Лукашэнка. — Дадумаліся падмяняць падставы іх звальнення. Дазвалюць гора-начальнікам, нібы нічога не было, зноў «успляваць» на адказных участках работы. Хочуць здавацца добрымі для ўсіх».

Аднак сістэма вызначана. Ніхто не мае права без згоды Прэзідэнта вярнуць начальніка на пэўную пасаду. Аднак бываюць выпадкі, што гэта неабходна. «Дырэктыву, заканадаўчыя акты падпісваў і прымаў рашэнні Прэзідэнт, таму, як бы там ні было, вы павінны гэтыя пытанні ўзгадніць з Прэзідэнтам, — падкрэсліў беларускі лідар. — Такіх выпадкаў было нямала. І нямала ўзгоднена. І быццам бы людзі працуюць нядрэнна. Але гэтая трэба вывучыць, каб даць ацэнку тым, хто хадайнічаў. У асноўным гэта губернатары».

На словах Аляксандра Лукашэнкі, калі хтосьці пачынае займацца лібералізмам, гэта недзяржаўны падыход. «Гэта кругавая парука, — удакладніў ён. — І адказнасць тут прамая губернатараў, старшыняў гар-, райвыканкамаў».

З мэтай узмацнення выканальніцкай дысцыпліны і адказнасці за работу з кадрамі Прэзідэнтам ставілася пытанне аб неабходнасці замацавання ўжо дзеючага механізма на заканадаўчым узроўні. Ёсць праект рашэння кіраўніка дзяржавы. Яго таксама абмяркоўвалі падчас нарады. Аднак Аляксандр Лукашэнка прапанаваў прысутным агучыць і іншыя рацыянальныя прапановы, якія таксама датычацца мер стымуляцыйнага характару, накіраваных на прыцягненне і захаванне кадравага патэнцыялу краіны.

«Галоўнае ў ацэнцы кадраў — вынік, — перакананы кіраўнік дзяржавы. — Даручана ў кожным рэгіёне рэалізаваць адзін інвестыцыйны праект — рэалізоўвайце. Не рэалізавалі — значыць, вам там рабіць няма чаго».

Прэзідэнт расказаў, што яму дакладваюць, быццам той ці іншы старшыня райвыканкама «не цягне». За яго заступаюцца: маўляў, вымову аб'явім, перавыхаваем. «Каго вы перавыхаваеце? — задаў рытарычнае пытанне беларускі лідар. — Яму (старшыні райвыканкама. — **«Зв.»**) ужо за 40, пад 50 — вы яго хочаце перавыхаваць? Калі ён не выдаў вынік, чаго вы ад яго чакаеце? Чым далей будзе — тым горш».

«ПАТРЭБЕН ВЫНІК»

Таму вынік, па словах кіраўніка дзяржавы, — перш за ўсё. І ў якасці прыкладу Прэзідэнт расказаў пра тое, што кожную раніцу ямў дасылаюць вынікі работы па сельскай гаспадарцы. Ён аналізуе сітуацыю, параўноўвае рэгіёны: у прыватнасці, у плане тэмпаў работ на сельгасугоддзях. «Я ж не параўноўваю Гродна і Брэст з Віцебскам, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — У Шулейкі (старшыні Брэсцкага аблвыканкама. — **«Зв.»**) ў два разы тэмпы работ па нарыхтоўцы кармоў вышэйшыя, чым у Гродна. У чым справа? А хто гарантуе Караніку (старшыні Гродзенскага аблвыканкама. — **«Зв.»**), што заўтра яго ўсе тэхніка не будзе перакінута ў Віцебск — для таго, каб аказаць падтрымку там? Вы чаго марудзіце? Гэта ж адноўкавая тэрыторыя, адноўкавыя ўмовы, нават у Гродне лепшыя».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы папярэдзіў: яму не трэба прыгожых апаведаў раз пасе, як нешта не атрымліваецца. «Мне патрэбен вынік, — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт. — Асабліва ў крытычнай сітуацыі. У сельскай гаспадарцы сітуацыя няхай не крытычная, але вельмі сур'ёзная. На наступным тыдні паслухаем урад, як ён думае з гэтай сітуацыі выходзіць».

Гледзячы на краіну, Аляксандр Лукашэнка і ацэньвае работу кадраў. «І думаю, чаму ў гэтым кірунку няма руху? — сказаў ён. — Чаго чакаеце? Калі дзесьці ўчастку ўвогуле высахлі, іх даўно трэба было пераараць. Чэрвень месяц. Што ў вас там вырасце? Таму ніякіх «размазванняў», размоў і бойкіх дакладаў не трэба. У мяне няма часу іх нават чытаць. Патрэбен вынік. І па гэтым крытэрыі будзем ацэньваць усе кадры».

Як адзначыў у сваім дакладзе кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка, у Беларусі выбудавана шматузроўневая сістэма работы з кадрамі, якая ахоплівае практычна ўсе пытанні камплектавання дзяржаўных органаў і арганізацый. Ён расказаў, што ёсць неабходная заканадаўчая аснова, якая рэгламентуе дзейнасць усіх суб'ектаў гэтай сферы адносін. Прынята 10 актаў кіраўніка дзяржавы, шэраг пастаноў урада, лакальных дакументаў міністэрстваў і выканкамаў.

У сувязі з гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што калі мы нешта ўдасканальваем, то ўсялякія акты ўрада, якія датычыцца кадравага пытання, трэба прыбраць. «Гэта не іх справа, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — Яны там няхай узгадняюць, мы ж без іх не прымаем рашэнні. Яны няхай уносяць хоць дзясятак кандыдатур вам — вы аналізуеце, уносіце Прэзідэнту. Я да чаго гэта? Не таму што не даяраю ўраду. Мы ўмеем любое пытанне «размазаць» па стале ад пад пасе ўсёй краіне. Навошта? Ёсць орган, які займаецца кадравай палітыкай. Навошта ў развіцё рашэнняў Прэзідэнта яшчэ нейкія пастановы ўрада? Гэта наша бяда».

Аляксандр Лукашэнка перакананы: ніякіх адсылачных дакументаў быць не павінна. Па яго словах, дастаткова аднаго нарматыўна-прававога акта, каб чалавек разумеў: рашэнне па кадрах прынята, і яно вычарпальнае.

Па выніках нарады кіраўнік дзяржавы даручыў разгледзець усе прапановы, агучаныя па пытанні ўдасканалення работы з кадрамі. Усё патрэбна сістэматызаваць, абагульніць і змясціць у комплексны дакумент, калі ён патрэбен. Аднак, па меркаванні Прэзідэнта, плён ад заканатворчасці будзе толькі ў тым выпадку, калі кожны будзе несці асабістую адказнасць — і за справу, якой займаецца, і за людзей, за якіх адказвае.

Вераніка КАНЮТА.

У тэму

«Падыходы ў кадравай рабоце павінны быць жыццяздольныя і запатрабаваныя»

Як адзначыў у размове з журналістамі **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА,** у цэлым у краіне створана шматузроўневая сістэма работы з кадрамі. «Дастаткова сістэмна выбудавана работа з кіруючымі кадрамі, — удакладніў ён. — За гэты блок работы непасрэдна адказвае Адміністрацыя Прэзідэнта».

По словах Ігара Сергеенкі, падчас нарады размова ішла аб тым, як у сучасных умовах актуалізаваць праграму кадравай работы, паколькі заканадаўчая аснова існые ў выглядзе нарматыўных актаў кіраўніка дзяржавы, рашэнняў міністэрстваў, аблвыканкамаў. «Гэта аб'ёмны кірунак дзейнасці ўсіх дзяржаўных органаў і арганізацый, — звярнуў увагу ён. — Падыходы, натуральна, неабходна пастаянна ўдасканальваць».

Сёння, па словах кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, шмат увагі ўдзяляецца шматлікім інструментам, якія ў стане садзейнічаць замацаванню маладых кадраў у рэгіёнах. «Размова ішла і аб тых магчымасцях нашай эканомікі, якія дазволяць павысіць матэрыяльны дабрабыт нашых спецыялістаў, — дадаў Ігар Сергеенка. — Асноўнае даручэнне — актуалізаваць тыя падыходы ў кадравай рабоце, каб яны былі жыццяздольныя, запатрабаваныя сённяшняй эканомікай, станам нашага грамадства».

ЗМАГАЦЦА ДА АПОШНЯГА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У змену горад Віцебск і яць найбліжэйшых раёнаў абслугоўвае ўсяго адна рэанімацыйная брыгада, таму і зразумела, што гэта сапраўды залаты рэзерв цэнтра. Дарожна-транспартныя здарэнні, катастрофы на аб'ектах вытворчасці з масавымі пашкоджаннямі, няшчасныя выпадкі, пагроза жыццю дзяцей і цяжарных жанчын у першую чаргу — на ўсе выклікі з пранізлівай сірэнай і сінімі светлавымі маячкамі ляціць «машына жыцця». Часта лік ідзе не на хвіліны, а на секунды — вытрымаць напружанае спаборніцтва са смерцю могуць нямногія.

Нягледзячы на тое, што выпадкі, калі выратаваць чалавека не ўдаецца, здараюцца, у сваёй рабоце Дзмітрый Уладзіміравіч прытрымліваецца пастулата змагацца да апошняга. Ён запускаў сэрца пацыенту праз паўтары гадзіны пасля спынення, а адноўчы ўрачу даводзілася змагацца з самім чалавекам за яго жыццё. У мужчыны здарыўся інфаркт, развілася фібрыляцыя жалудачкаў, а шмат гадоў таму ў карэтах хуткай дапамогі яшчэ не было такога сучаснага абсталявання, як цяпер. Мужчыне пачалі праводзіць закрыты масаж сэрца і штучную вентыляцыю лёгкіх, ён аднавіў самастойнае і... пачаў адштурхоўваць медыкаў і лаяцца, не разумеючы, што з ім робяць. Скончылі маніпуляцыю — пацыент зноў страціў прытомнасць, і так тры разы, пакуль не прыехала спецыяльная брыгада і не правяла электрычную дэфібрыляцыю.

Часта людзі самі не разумеюць, наошта выклікаюць хуткую дапамогу. Напрыклад, на адным з выклікаў жанчына пад уздзеяннем алкаголю скардзілася, што ёй дрэнна, бо муж не пускае яе дадому. Бываюць і сітуацыі, калі людзі могуць абысціся без дапамогі — падняўся ціск, прапісаньа ўрачом таблеткі дома ёсць, але прымаць іх самастойна без нарады медыкаў пацыент не хоча. Некаторым людзям проста сумна, а за час, пакуль брыгада выязджае на такі выклік, можа здарыцца сапраўдная бяда. Напэўна, адсутнасць штрафаў за падобнае дае грамадзянам права на свавольства, а яшчэ фарміруе падманлівае ўсведамленне, што медыцынская дапамога бясплатная. Насамрэч, каштуе грошай і амартызацыя аўтамабіля, і паліва, і медыкаменты, і працоўны час медыкаў...

СІЛА — У КАЛЕКТЫВЕ

У брыгадзе з Дзмітрыем Дубакіным працуюць фельчары Вікторыя Абелец, Галіна Макарава, Вадзім Казлоўскі і кіроўца Яўген Іваноў. Дзмітрый Уладзіміравіч сам падбіраў калектыў з тых, з кім ён ужо не першы дзень у страі. Гэта вопытныя і адказныя людзі, якія разумеюць яго з паўслова, што ў межах экстраннай меддапамогі асабліва каштоўна. З Вадзімам Дзмітрый працуе на адной ніве больш як 15 гадоў, за гэты час прафесійныя стасункі перараслі ў сяброўства. За змену бывае і 10 выклікаў, а перыяд эпідэміі брыгада называе адным з самых цяжкіх. «Тады было шмат пацыентаў з цяжкай дыхальнай недастатковаасцю, не было часу нават прысесці. І мы былі на перадавой, не баяліся захварэць. Галоўнае — аддаць свой медыцынскі доўг людзям», — успамінае Дзмітрый Дубакін.

Дзмітрый ДУБАКІН, Вікторыя АБЕЛЕЦ, Вадзім КАЗЛОЎСКІ.

Ганарыцца кіраўніцтва цэнтра гэтым маленькім, але зладжаным калектывам па праве: у мінулым годзе рэанімацыйная брыгада на чале з Дзмітрыем Уладзіміравічам прывезла з міжнароднага конкурсу экіпажаў хуткай дапамогі першае месца. У спаборніцтве, якое праходзіла некалькі дзён, бралі ўдзел 13 каманд з Беларусі і дзве з Расійскай Федэрацыі. Медыкам трэба было не толькі паказаць тэарэтычныя веды, але і праявіць прафесіяналізм і камандную работу ў розных практычных сітуацыях. Віцебская рэанімацыйная брыгада блізкуча прайшла ўсе этапы конкурсу і забрала ў горад на Дзвіне «золата».

У 2020 годзе аўтапарк цэнтра абнавілі, цяпер усе аўтамабілі хуткай дапамогі — перасоўныя медыцынскія комплексы, што значна пашырае магчымасці функцыянальнай дыягностыкі і дапамогі. У далёкіх 90-х, успамінае ўрач, у карэце быў толькі электракардыёграф, тады капрызны ў эксплуатацыі, і кіслародны інгалятар на два літры. Сёння ў рэанімацыйным аўтамабілі ёсць апарат штучнай вентыляцыі лёгкіх, кіслародны канцэнтратар, дэфібрылятар, апарат для закрытага масажу сэрца, ларынгаскоп, кровазамяшчальныя растворы — адным словам, усё неабходнае, каб вярнуць пацыента да жыцця.

АСАБЛІВАСЦІ ПРАФЕСІІ

Пік выклікаў пачынаецца з 16 гадзін і працягваецца да ночы. За суткі міжраённы цэнтр «Віцебск» прымае да 500 званкоў, 70 працэнтаў з якіх — неадкладныя выклікі. Асабліва гарачымі для брыгады з'яўляюцца святочныя дзяжурствы. Так, успамінае Дзмітрый Уладзіміравіч, за адну навагоднюю ноч здарылася шэсць трагедый...

У яго практыцы было нямала выпадкаў клінічнай смерці з інфарктам на дапітальным этапе. Галоўнае — правільна інтэрпрэтаваць папярэднія сімптомы. Але клінічную смерць дактары ніколі не пераблытаюць з сапраўднай — урач расказаў пра эфект «кашачага вока». Калі смерць усё ж такі наступіла, то ў першыя хвіліны яўных яе прыкмет няма, акрамя формы зрэнкі. Дапускаецца ў медыцынскім асяроддзі падчас закрытага масажу сэрца 1-2 зламаныя рэбры, але толькі ў дарослых людзей. Прычым такія наступствы могуць быць не толькі ад ручных, але і ад механічных маніпуляцый.

СЯМЕЙНАЯ ДЫНАСТЫЯ

Па сцяжынцы, якую калісьці абраў па прыкладзе сваёй маці Дзмітрый Дубакін, сёння ідзе і яго сын Саша, які заканчвае медуніверсітэт. Нягледзячы на перасцярогі бацькі аб складанасці прафесіі, юнак з другога курса працуе і набіраецца вопыту на станцыі хуткай дапамогі. Пасля атрымання дыплома будзе ўрачом-анестэзіёлагам-рэаніматолагам у радзільным доме. У Аляксандра на выбар будучай прафесіі паўплывала жыццёвая сітуацыя, пасля якой ён цвёрда вырашыў, што будзе дапамагаць людзям, як у дзяцінстве медыкі дапамагалі яму. «Калі сын быў маленькі, трапіў пад лесавоз, атрымаў цяжкія пашкоджанні. Тады ўрачы доўга і ўпарта змагаліся за яго і перамаглі. Магчыма, гэта пакінула ў яго памяці яркі след», — дзеліцца ўспамінамі мужчына.

У вольны час Дзмітрый Уладзіміравіч захапляецца рыбалкай, зборам грыбоў і рамонтам машын. І не любіць расказваць ра свае дасягненні, сярод якіх — Падзяка ад Прэзідэнта, званне «Чалавек года Віцебшчыны — 2022», шматлікія абласныя ўзнагароды. Ён проста робіць сваю работу і прызнаецца, што за 30 гадоў ні разу не думаў аб тым, каб сысці з прафесіі.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

Маніторынг

Большасць беларусаў задаволена паслугамі дзяржаўнай медыцыны

Белстат распавёў, як выглядае партрэт беларускага медыка і ў чым мы апераджаем краіны Еўропы

Традыцыйна ў трэцюю нядзелю чэрвеня медыцынскія работнікі святкуюць сваё прафесійнае свята. Заўтра прымаць віншаванні ў нашай краіне будуць 55,1 тысячы ўрачоў (сярод іх 48 тысяч прыхільнікаў) і 124,6 тысячы сярэдніх медыцынскіх работнікаў. Нацыянальны статыстычны камітэт намаляваў партрэт урача і медыцынскай сястры ў Беларусі. У прыватнасці, беларускі ўрач — гэта жанчына 42 гадоў, якая працуе па тэрапеўтычным профілі. Яе сярэдняя зарплата летась была 2306,8 рубля.

Сярод урачоў пераважная большасць — жанчыны (73,9 %), мужчын адпаведна 26,1 %. Сярэдні ўзрост жанчын у гэтай прафесіі — 42,4 года, мужчын — 44,4 года. Сярод сярэдніх медыцынскіх работнікаў яшчэ больш жанчын — 95,2 %, іх сярэдні ўзрост 43,5 года. Мужчын сярод сярэдняга медыцынскага персаналу ўсяго 4,8 %, затое жны маладзейшыя — іх сярэдні ўзрост 38,5 года.

Сярод урачоў вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю маюць 15,8 %, першую — 38,5 %, другую — 22,1 %. Больш за 17,6 тысячы ўрачоў практыкуюць па тэрапеўтычным профілі, 14 тысяч — хірургі, 5,3 тысячы — стаматолагі, 4,5 тысячы — педыятры, у 6,7 тысячы — медыка-дыягнастычны профіль.

У краіне 83,5 тысячы медыцынскіх сясцёр і братоў, 10,3 тысячы фельчараў, 9,1 тысячы фельчараў-лабарантаў, 4,6 тысячы акушэрак, 3,4 тысячы рэнтген-лабарантаў, 1,8 тысячы зубных фельчараў і 1,6 тысячы зубных тэхнікаў.

На 10 тысяч беларусаў прыпадае 52 практыкуючыя ўрачы і 135 сярэдніх медыцынскіх работнікаў. Забяспечанасць медыкамі ў нашай краіне вышэйшая, чым у некаторых краінах Еўропы, у прыватнасці, такіх як Іспанія (45,8 урача на 10 тысяч чалавек), Германія (45,3), Балгарыя (42,8), Італія (41,3). Лідарскую пазіцыю займае наша краіна па гэтым паказчыку і сярод краін СНД.

Забяспечанасць медыкамі крыху адрозніваецца па рэгіёнах. Найвышэйшая яна ў сталіцы, дзе на 10 тысяч мінчан прыпадае 72 урачы і 136 сярэдніх медыцынскіх работнікаў. У Гродзенскай вобласці гэты паказчык складае 57 урачоў і 141 сярэдні медыцынскі работнік. А найменшым ён выглядае на Міншчыне: 38 урачоў і 118 сярэдніх медыцынскіх работнікаў.

Сёння медыцынскую дапамогу беларусам аказваюць 2660 амбулаторна-паліклінічных арганізацый, 585 бальніц, 119 станцый хуткай медыцынскай дапамогі. Найбольшая іх колькасць у Мінску — 662 паліклінікі і 44 бальніцы. На другім месцы Мінская вобласць — 394 паліклінікі і 113 бальніц. А вось найменшы паказчык на Магілёўшчыне — 262 паліклінікі і 59 бальніц.

Па даных выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак па ўзроўні жыцця, праведзенага ў 2021 годзе, задаволены і цалкам задаволены апошнім вопытам карыстання дзяржаўнымі паслугамі ў галіне аховы здароўя 88,9 % беларусаў. Прычым у сельскай мясцовасці колькасць задаволеных аказалася большай — станоўчы адказ давалі 95,2 % сяльчан і 87,1 % гарадскіх жыхароў.

Летась у Беларусі праведзена 827 236 аперацый, сярод іх 113 252 — пры дапамозе эндаскапічнай апаратуры і лапараскапічнага абсталявання. Летась зроблена 1058 аперацый на трансплантацыі, у тым ліку 350 — па перасадцы нырак, 100 — печані, 40 — сэрца. У рэйтынгу краін свету па трансплантацыі нырак Беларусь знаходзіцца на 5-м месцы, печані — 10-м, сэрца — 11-м.

Падрыхтоўку сярэдняга медыцынскага персаналу ў Беларусі вядуць 16 устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, летась яны выпусцілі 4,4 тысячы спецыялістаў. Урачоў рыхтуюць 5 ВНУ, і ў 2022 годзе іх дыпломы атрымалі 3,2 тысячы дактароў.

Намінальная налічаная сярэдняя зарплата медыкаў летась склала 1377,9 рубля. Пры гэтым ва ўрачоў — 2306,8 рубля, у сярэдняга медыцынскага персаналу — 1361 рубель.

Летась падрыхтаўнікі 148 краін скарысталіся паслугамі беларускай медыцыны. Найчасцей гэта былі грамадзяне Расіі, Украіны, Казахстана, Латвіі, Кітая, Ізраіля і Азербайджана.

Алена КРАВЕЦ.

СВЯТА ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ

Сімвалам «Купалля» ў Аляксандрыі сёлета стане аб'ёмная фігура бусла, які ляціць. Аб гэтым журналістам расказаў намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА ў час пасяджэння пастаянна дзейнага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») у Шклоўскім раёне.

Паводле слоў Валерыя Малашкі, свята, якое пройдзе 8—9 ліпеня, разгорнецца на плошчы 8 гектараў, што супастаўна з 10 футбольнымі палямі, пры гэтым на кожным участку будзе свая інтэрактыўная зона або пляцоўка з кухняй, забаўкамі або дэкаратыўна-прыкладной творчасцю. Асноўны сімвал свята пастане ў выглядзе аб'ёмнай фігуры бусла, які ляціць. Гэты абразэр беларускай зямлі будзе скарыстаны ў афармленні сцэнічнай пляцоўкі. Самі святочныя пляцоўкі будуць афармлены з улікам беларускай дзяржаўнай сімволікі і сімволікі Саюзнай дзяржавы, дапоўнены лагатыпамі Года міру і стваральнай працы, а таксама свята «Купалле».

Чакаецца вялізная колькасць гасцей: прыедуць усе рэгіёны Беларусі, таксама пацвердзілі свой удзел 19 рэгіёнаў Расіі. «Усе мы розныя, але аб'ядныя любоўю да сваёй гістарычнай і культурнай спадчыны», — падкрэсліў Валерый Малашка.

Ён таксама расказаў, што адзначаецца вялікі попыт з боку суб'ектаў гандлю, якія хочуць прадставіць сваю прадукцыю на кірмашовым полі. «Рэгістрацыю гандлю мы спынілі 1 мая, таму што нашы пляцоўкі ўжо не ўмяшчаюць усіх ахвотных. Наколькі гэта магчыма, мы арганізавалі дадатковыя рады. Разгорнуцца творчыя пляцоўкі, малая і вялікая сцэнічныя пляцоўкі, трансліраваць тое, што адбываецца, будуць тры вялікія экраны», — сказаў Валерый Малашка.

«З кожным годам Аляксандрыя ўсё больш і больш збірае сяброў, — адзначыў на пасяджэнні аргкамітэта **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА**. — Тыя, хто прыязджаў на александрыйскую зямлю раней, бяруць сваіх сяброў, каб дакрануцца да такога магутнага, сяброўскага і шчырага фестывалю, які праводзіцца па ініцыятыве кіраўніка нашай дзяржавы.Тут сканцэнтраваны ўвесь каларыт беларускай культуры і фальклору, нашы знакамітыя майстры прыкладнога мастацтва дэманструюць свае найлепшыя дасягненні. Важна, што з году ў год да нас прыязджае шмат сяброў і калег з Расіі».

Паводле слоў Ігара Петрышэнкі, у праграме свята навязная ўдзяляюцца дзве цыбіны. Так, сёлета падчас фестывалю традыцыйна пройдзе фінал рэспубліканскага сямейнага сельскагаспадарчага рамёства «Уладар вёскі». У Аляксандрыі будуць ушаноўваць маладыя сем'і, якія дабіліся вынікаў і прайшлі сур'ёзныя выпрабаванні. Актыўна развіваецца творчы складнік, аднак арганізатары не будуць да канца раскрываць інтрыгу, каб у гасцей было жаданне прыехаць, наведаць гала-канцэрт і ўбачыць усё на свае вочы.

«Упершыню ў гэтым годзе мы плануем сумесны з Расійскай Федэрацыяй канцэрт у рамках Саюзнай дзяржавы, які адбудзецца на пляцоўцы ў Аляксандрыі да нашага асноўнага галаканцэрта, — удакладніў Ігар Петрышэнка. — Цікавы складнік — дэманстрацыя навінак беларускай прадукцыі ад айчынных вытворцаў, прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў. Напярэдадні II Гульняў краін СНД — важнага спартыўнага мерапрыемства, якое адбудзецца ў нашай краіне з 4 да 14 жніўня, будзе прадэманстравана, як мы рыхтуемся да яго. Хачу падкрэсліць, што з кожным годам свята «Купалле» становіцца больш разнастайным і цікавым.

Паводле БелТА.

Будзь у курсе!

НА СВЯТА ДА СЯБРОЎ — З КАМФОРТАМ

Для дастаўкі гасцей і ўдзельнікаў рэспубліканскага свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») Беларуская чыгунка прызначыла 14 дадатковых цягнікоў. Пра гэта інфармуе прэс-цэнтр магістралі.

Графік іх руху складзены з улікам часу пачатку і заканчэння канцэртнай праграмы свята, якое пройдзе 8 ліпеня ў аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна.

Так, 8 ліпеня ў дадатак да дзейнага раскладу прызначаны цягнікі рэгіянальных ліній эканомкласа Магілёў — Копысь — Магілёў і Орша — Копысь — Орша. 9 ліпеня дадаткова прызначаны цягнікі рэгіянальных ліній эканомкласа зносінамі Копысь — Магілёў і Копысь — Орша. Таксама 8 ліпеня цягнікам міжрэгіянальных ліній бізнес-класа № 705 Полацк — Магілёў і № 706 Магілёў — Полацк прадугледжаны прыпынак на станцыі Копысь.

Такім чынам, з улікам дзейнага графіка руху, 8 і 9 ліпеня на станцыі Копысь будуць рабіць прыпынкі 28 цягнікоў рэгіянальных і міжрэгіянальных ліній, якія курсіруюць з Магілёва, Оршы, Віцебска, Гомеля, Полацка і Брэста.

Папярэдні продаж праязных дакументаў на цягнікі рэгіянальных ліній эканомкласа адкрываецца за 10 сутак да даты адпраўлення цягніка.

Набыць праязныя дакументы можна на афіцыйным інтэрнэт-сайце Беларускай чыгункі ў раздзеле «Паслугі пасажырам» (pass.rw.by), з дапамогай мабільнага дадатка «БЧ. Мой кліент», а таксама ў чыгуначных касах БЧ.

Больш падрабязную інфармацыю аб раскладзе руху цягнікоў, прыпынках і кошце праезду ахвотныя наведаць рэспубліканскае свята «Купалле» могуць атрымаць на афіцыйным інтэрнэт-сайце Беларускай чыгункі www.rw.by, а таксама ў Кантакт-цэнтры па тэлефоне 105.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Напярэдадні

КАЛІ МАЕЦЕ ШТО СКАЗАЦЬ...

Аж з сямнаццатага года —
Шчасце ў хаце ці бяда, —
Ты прыходзіла к народу —
Беларуская «Звязда»...

Гэтыя дні безлічі іншых прыгожых радкоў склалі пра газету яе чытачы! Здаралася — падчас новай падпіскай кампаніі ці напярэдадні нейкага свята, але ж найчасцей — перад круглымі датамі ды юбілеямі, бо даведчана газета і свае 50, і 70, а нядаўна (няшмат хто можа гэтым пахваліцца) — дык нават 100! Святкавала і першыя пяць пасля.

Цяпер на падыходзе новая падзея ў жыцці выдання, новая круглая лічба: у суботу, 24 чэрвеня, выйдзе трыццацітысячны (!) нумар «Звязды» — газеты-асветніцы, дарадчыцы, партызанкі, газеты-заступніцы і сяброўкі... Некаму з чытачоў-падпісчыкаў яна дасталася ў спадчыну ад дзядоў ці бацькоў, нехта падпісаўся сам... Не так важна, калі: дзесяцігоддзі таму альбо месяцы... Калі маеце што сказаць, пішыце: добрыя словы і кошцы прыемныя, нават неабходныя — лічылі класікі, — як неабходная тая ж змазка для колаў, каб яны ехалі далей.

Шматпакутны Мінск за тры гады акупацыі зведаў нямала гора. Жыхароў горада знішчалі ў вялікай колькасці — самымі рознымі спосабамі. Нацысты не шкадавалі нікога: ні старых, ні малых, ні хворых, ні зняволеных... Найбольш масавае месца знішчэння людзей на тэрыторыі беларускай сталіцы ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі знаходзілася ў цяперашнім мікраёне Масюкоўшчына. Аб тым, што з ліпеня 1941 да чэрвеня 1944 года тут размяшчаўся лагер для ваеннапалонных («Шталаг-352»), дзе нацысты пазбавілі жыцця звыш 80 тысяч чалавек, сёння нагадвае мемарыяльны комплекс. Каля падножжа манумента гарыць Вечны агонь, які сведчыць аб тым, што сучаснае пакаленне беларусаў памятае аб гэтых людзях, якія заўчасна сышлі ў іншы свет.

АБЕЛІСКІ ПАРАНЕНАЙ ЗЯМЛІ

Маўклівая памяць шумных вуліц

Карэспандэнты «Звязды» разам з кіраўніцтвам пракуратуры Першамайскага раёна Мінска наведалі масавыя пахаванні ахвяр нацызму, размешчаныя ў сталіцы

Брацкая магіла ў раёне вуліц Бялінскага — Калініна.

Мала хто ведае, што «Шталаг-352» складаўся з дзвюх частак. Каля тагачасной вёскі Масюкоўшчына (там, дзе сёння знаходзіцца мемарыяльны комплекс) размяшчаўся «Лясны лагер». Аднак быў яшчэ і «Гарадскі лагер» — цяпер гэта тэрыторыя ў раёне вуліц Коласа, Бялінскага і Калініна. Гуляючы па старой частцы Першамайскага раёна, многія мінчане, а тым больш госці сталіцы, нават не падазраюць, што восем дзесяцігоддзяў таму на месцы ўтульных сёння вуліц і паркаў у нечалавечых умовах утрымліваліся савецкія ваеннапалонныя. Складана ўявіць і тое, што там, дзе кожны дзень жыхары крочаць на работу або даханты, дзе адпачываюць сем'ямі і атрымліваюць асалоду ад птушыных спеваў, вечным сном спяць людзі, вялікая колькасць людзей...

Разам з кіраўніцтвам пракуратуры Першамайскага раёна Мінска карэспандэнты «Звязды» наведалі брацкія магілы «Гарадскога лагера» і ўсклалі да помнікаў кветкі. Гісторыя гэтых месцаў — у нашай публікацыі.

ЛАГЕР У ПУШКІНСКІХ КАЗАРМАХ

У першыя месяцы акупацыі Мінска на месцы «Гарадскога лагера» размяшчаўся часовы перасыльны — «Дулаг № 126». Па тым часе фактычна гэта была ўскраіна сталіцы. Пушкінскі пасёлак — менавіта так тагачасныя жыхары называлі тэрыторыю, праз якую праходзяць сучасныя вуліцы Сурганава, Коласа, Калініна і Чорнага. Сваю назву пасёлак атрымаў у гонар стагоддзя з дня гібелі вядомага рускага паэта.

Да вайны на тэрыторыі Пушкінскага пасёлка размяшчаўся артылерыйскі полк. У трох цагляных трохпавярховых будынках, якія дагэтуль захаваліся, знаходзіліся казармы. Асобна быў пабудаваны дом для афіцэрскага складу, у спецыяльным ангары захоўвалася ўзбраенне і аўтатрактарная тэхніка. Акупаваўшы Мінск, нацысты ўтрымлівалі тут ваеннапалонных. Абнеслі тэрыторыю лагера плотам з калючым дротам, дадаткова ўзмацніліся высокай драўлянай агароджай. Праз кожныя сто метраў стаялі вышкі, дзе за становішчам у лагеры сачылі часавыя. Ахоўвалі лагер дзве роты нямецкага 332-га батальёна апалчэння.

7 лістапада 1942-га часовы лагер «Дулаг № 126» перайменавалі ў стацыянарны лагер «Гарадскі лагер «Шталаг 352», і ён стаў гарадскім аддзяленнем галоўнага лагера «Шталаг 352» у Масюкоўшчыне. Зняволеныя пушкінскіх казармаў паміралі ад ран, хвароб, знясілення і холаду — гэтаму садзейнічалі ўмовы, у якіх яны знаходзіліся, а таксама мізэрнае харчаванне. На суткі вязням выдавалі па 80—100 грамаў эрзац-хлеба (сурагат хлеба з пылавінне), поліўку з гнілой бульбы і саломы, часам з дабаўленнем тухлага конскага мяса. Тыя, хто правіншыўся, паёк атрымлівалі раз у тры дні.

Акрамя голаду, людзі паміралі ад тыфу. Немцы нават стварылі эксперыменты па лячэнні захворвання. Аднак усё было дарэмна: з тыфознага барака, дзе ўтрымліваліся хворыя, быў толькі адзін шлях — на могілкі. У першы год існавання лагера каля 70 % ваеннапалонных памерла ад знясілення, 30 % — ад тыфу і іншых захворванняў. Некаторыя вар'яцелі і заканчвалі свае жыццё самагубствам.

Многіх зняволеных хавалі непасрэдна на тэрыторыі лагера. У брацкай магіле, побач з пушкінскімі казармамі, вечным сном

спачывае больш як паўтысячы ваеннапалонных. У памяць аб іх устаноўлены абеліск, на якім пазначана, што «тут пахаваны ахвяры фашызму, закатаваныя ў канцэнтрацыйных лагерях у гады акупацыі Беларусі». Вядома, што лагер функцыянаваў да вясны 1943 года. Потым на гэтым месцы размяшчалася гестапа.

Пахаванне знаходзіцца на тэрыторыі камандавання Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны. Ваеннаслужачыя ўтрымліваюць яго ў ідэальным стане. Яны добра ведаюць гісторыю гэтага месца і перадаюць яе з пакалення ў пакаленне. У 2016 годзе

Масавае пахаванне па вуліцы Талбухіна.

на тэрыторыі воінскага злучэння працаваў пошукавы батальён. Былі знойдзены астанкі ахвяр фашызму. Экспертыза пацвердзіла, што яны належаць ваеннапалонным таго перыяду. Мірных жыхароў сярод іх выяўлена не было.

Як расказвае **старшы афіцэр упраўлення ідэалагічнай работы камандавання Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны Яўген ВАЛЬЧЭЎСКІ**, лагер быў моцна перапоўнены. «Для ўзвядзення новых будынкаў для ваеннапалонных патрабавалася будаўнічы матэрыял, — заўважае падпалкоўнік. — Па цэглу ваеннапалонных накіроўвалі на чыгуначны вакзал, куды яны хадзілі пешшу. Ваеннапалонны браў па дзве-тры цагліны (шмат не возьмеш) і ішоў у лагер — а гэта прыкладна 30 кіламетраў. Многія не адолывалі гэты шлях і паміралі па дарозе. Тых, хто не змог дабрацца да лагера з-за свайго фізічнага стану, расстрэльвалі. Хавалі людзей там, дзе яны падалі. Па маршруце ад сучаснай вуліцы Якуба Коласа да чыгуначнага вакзала праходзіла алея смерці».

Аб барацьбе савецкіх воінаў, якія пасля цяжкіх баёў у акружэнні апынуліся ў фашысцкай няволі, у 1962 годзе Сцяпан Злобін напісаў кнігу «Знікла без вестак». У гады акупацыі ён быў санітарам у лагерным шпіталі, які размяшчаўся на тэрыторыі «Гарадскога лагера». У сваім гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Рукапіснае выданне ў 1949 годзе знайшоў савецкі школьнік Іосіф Валюкевіч, які праходзіў праз тэрыторыю будынкаў шпіталя і знайшоў пакет: у ім ляжаў складзены ў некалькі разоў ліст паперы. Гэта быў адзін з нумароў «Пленной правды».

Дзякуючы газеце, стала вядома, што некаторым ваеннапалонным удавалася ўцякаць з лагера. Вось што паведамляецца ў адным з артыкулаў: *«З лагера пры шпіталі ... сышлі двое: кухар — вясёлы жыццярадасны гарманіст і маленькая, як дзяўчынка, сястра Воля. Рэдакцыя ад душы жадае ім поспеху. Паведамляюць, што з гарадской пастаяннай каманды ў 30 чалавек збеглі 26. Засталіся 4».*

Сцяпан Злобін таксама рыхтаваўся да ўцёкаў, але па данос галоўнага ўрача быў накіраваны ў канцлагер Цайтхайн у Германіі, дзе знаходзіўся да кастрычніка 1944 года. Там ён таксама ўзначальваў падполле, але зноў знайшоўся здраднік. Затым Злобіна накіравалі ў польскі лагер, адкуль ён быў вызвалены ў студзені 1945 года.

З 10 ТЫСЯЧ — 245 ВЯДОМЫХ ІМЁН

Яшчэ адно буйное пахаванне сталіцы знаходзіцца ў скверы па вуліцы Талбухіна, акурат насупраць Мінскага гадзіннікавага завода. У брацкай магіле пахавана звыш дзесяці тысяч савецкіх воінаў, партызан і мірных жыхароў, закатаваных або расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—1944 гг.». Удалося ўстанавіць імёны толькі 245 загінулых...

Помнік ахвярам генацыду ў парку імя Чалюскінцаў.

МЕСЦА СМУТКУ Ў ПАРКУ ЧАЛЮСКІНЦАЎ

Ці многія, хто бывае ў аблюбаваным мінчанамі і гасцямі сталіцы парку культуры і адпачынку імя Чалюскінцаў, звярталіўвагу на тое, што ў паўночна-ўсходняй яго частцы знаходзіцца брацкая магіла? Тут, у баку ад атракцыёнаў і алей, па якіх звычайна гуляе вялікая колькасць людзей, вечным сном спяць воіны Чырвонай Арміі, падпольшчыкі і мірныя жыхары, знішчаныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—1944 гадах.

— У свой час на невялікім пятачку была выяўлена 41 яма-магіла, — расказвае гісторыю гэтага месца **намеснік пракурора Першамайскага раёна Мінска Уладзіслаў ВАЛУЕВІЧ**. — Тут, як і ў іншых месцах, пра якія вялася размова вышэй, хавалі загінулых ваеннапалонных, якіх акупанты ўтрымлівалі ў пушкінскіх казармах і на тэрыторыі сельгасвыставы. Целы зняволеных вазілі ў парк Чалюскінцаў на колах і закопвалі ў магілах-траншэях. Пасля вызвалення Мінска Надзвычайнай камісіяпалічыла, што тут пахавана каля дзесяці тысяч чалавек.

Як высветлілася, астанкі належалі не толькі былым ваеннаслужачым, але і мірным жыхарам. Устаноўлены імёны толькі дваіх ахвяр фашызму — тых, хто памёр ад ран у 1944 годзе, калі Мінск ужо быў вызвалены. Пасля вайны месца масавага пахавання агарадзілі. Былі пракладзены дарожкі, афармлены індывідуальныя надмагільныя пліты. У 1955 годзе тут усталявалі помнік. Бетонная фігура маці, якая смуткуе, заклікае падарожных спыніцца, задумацца аб тым, які крывавы след на нашай зямлі пакінула вайна.

У 2005 годзе пачалася рэканструкцыя, і парк Чалюскінцаў, у тым ліку скульптура «Тужлівая маці», былі ўключаны ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

МОГІЛКІ НА ДЗЯВЯТЫМ КІЛАМЕТРЫ

